# Салон сабраў сяброў Элізы



Усё, як у арыстакратычным салоне Элізы Ажэшкі

Трапіць у Шчучыне на сустрэчу з Элізай Ажэшкай, аказваецца, можна: утульна і крыху загадкава размясціўся ў той вераснёўскі дзень у зале ЗАГСа літаратурны салон "У Элізы Ажэшкі". Нам таксама пашчасціла пабачыць тэатралізаванае прадстаўленне, дзе вуснамі самой юнай пісьменніцы гаварылі супрацоўнікі Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі імя Я. Карскага. Звярталіся да гледачоў таксама малады і сімпатычны Максім Багдановіч, мудры сваёй беларускасцю Францішак Багушэвіч.

А наўкруг – выстава рэдкіх выданняў і фотаздымкаў з фонду бібліятэкі і прыватных калекцый. Тут жа на працягу дня тройчы адбыўся прагляд дакументальных фільмаў, прысвечаных Элізе Ажэшцы. Усіх вельмі зацікавіла магчымасць фотамайстэрні "У пані Элізы", дзе можна было "застацца" ў гісторыі побач з Ажэшкай і яе акружэннем.

Але рэчаіснасць вяртала нас на сцэну пад адкрытым шчучынскім небам, і мы – на літаратурным свяце "Бацькаўшчына светлая мая". Мільгаюць знаёмыя постаці і твары: упэўнена крочыць па плошчы ў накірунку да палаца Друцкіх-Любецкіх знакаміты паэт Алесь Бадак, на радзіму (ён з Астравеччыны) са сваёй латвійскай дэлегацыяй прыехаў і паэт Станіслаў Валодзька, з вялікімі добрымі вачыма і такім жа сэрцам бярэ ўдзел у свяце Юрка Голуб і яго сябар-пісьменнік Валянцін Дубатоўка, паэт Віктар Шніп. І прэзентацыі, прэзентацыі… У Шчучын з'ехаліся з лепшымі выданнямі і праектамі прадстаўнікі з усёй рэспублікі. А далей – сустрэчы з пісьменнікамі, паэтамі, журналістамі. Па сутнасці, гэта – прадаўжэнне папярэдняга, 5 верасня, паэтычнага вечара, толькі памножанага на мноства новых сустрэч і ўражанняў.

**Рычард БЯЛЯЧЫЦ.**
**Фота аўтара.**